БЕЗ МАЛОГА СТО АБ'ЕКТАЎ

Прэзідэнт Указам №30 зацвердзіў Дзяржаўную інвестыцыйную праграму на 2016 год

На фінансаванне 99 аб'ектаў, уключаных у праграму, плануецца накіраваць Br4 трлн 584,1 млрд, у тым ліку за кошт дзяржаўных капітальных укладанняў — Br1 трлн 156,1 млрд, сродкаў рэзервовага фонду Прэзідэнта Беларусі — Br730 млрд, сродкаў рэспубліканскага дарожнага фонду — Br1 трлн 65,5 млрд, сродкаў на захаванне і пашырэнне сельскагаспадарчых угоддзяў (аб'екты меліярацыі) — Br517 млрд, сродкаў дзяржаўнага мэтавага бюджэтнага фонду нацыянальнага развіцця — Br1 трлн 115,4 млрд.

У 2016 годзе намечана пачаць фінансаванне будаўніцтва (рэканструкцыі) 19 новых аб'ектаў, у тым ліку 9 жылых дамоў для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-сірот, дзіцячага сада на 190 месцаў у мікрараёне №2, водазабора №2 і кацельні №2 у Астраўцы, другой штучнай узлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце Мінск. З ліку аб'ектаў, якія пачынаюць будавацца, 11 плануецца ўвесці ў эксплуатацыю сёлета.

Усяго ў 2016 годзе ў адпаведнасці з праграмай прадугледжваецца ўвесці 36 аб'ектаў, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

ВЫСОКАЯ АЦЭНКА

Прэзідэнт падпісаў два ўказы аб прысуджэнні дзяржаўных узнагарод

У прыватнасці, намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі Мікалай Мельчанка ўзнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені. У ліку ўзнагароджаных ордэнам Францыска Скарыны — вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Тадэвуш Коктыс, медалём «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку» — міліцыянер-вадзіцель групы затрымання роты міліцыі Барысаўскага аддзела дэпартамента аховы МУС Сяргей Глод, «За працоўныя заслугі» — дырэктар ААТ «Піянер-Агра» Капыльскага раёна Аляксандр Макарчук, медалём Францыска Скарыны — акцёр кіно, каскадзёр і пастаноўшчык трукаў, член Беларускай гільдыі акцёраў кіно Генадзь Чацверыкоў.

Узнагарод удастоены таксама прадстаўнікі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Так, медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання Міхаіл Кустоўскі. Ганаровае званне «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» прысвоена прарэктару па вучэбнай рабоце — дырэктару Інстытута дзяржаўнай службы Сяргею Шаўруку.

Акрамя таго, ганаровыя званні прысвоены прадстаўнікам іншых сфер. У прыватнасці, заслужаным артыстам Беларусі стала вядучы майстар Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Галіна Букаціна, заслужаным дзеячам мастацтваў Беларусі — загадчык кафедры інструментоўкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Вячаслаў Кузняцоў, заслужаным майстрам спорту Беларусі — спартсмен-інструктар нацыянальнай каманды па цяжкай атлетыцы Дзіна Сазанавец і іншыя.

НАВУКА НА СЛУЖБЕ ЭКАНОМІКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Яшчэ адзін кірунак працы Акадэміі — стварэнне так званых кластараў, устаноў, скіраваных на выяўленне «кропак росту» і апераджальных абласцей развіцця навукі. Ужо працуе некалькі дзясяткаў такіх цэнтраў. На базе НАН пастаянна ствараюцца вытворчыя прадпрыемствы. Адзін з самых буйных праектаў, які ўжо знаходзіцца ў стадыі рэалізацыі, — «Белбіяград», шматфункцыянальны навукова-тэхнічны парк.

«Мінулы год быў Годам моладзі, і вельмі важна, што пятая частка даследчыкаў НАН — гэта маладыя навукоўцы, — адзначыў Уладзімір Гусакоў. — А ўвогуле, я сказаў бы, што акадэмія навук — гэта маладзёжная арганізацыя, сярэдні ўзрост супрацоўнікаў знаходзіцца на ўзроўні 50 гадоў. Існуюць цэлыя маладзёжныя лабараторыі і праекты, а іх удзельнікі атрымліваюць шматлікія прэміі і ўзнагароды, у тым ліку міжнародныя».

«Добрая сістэма адукацыі без добрай навукі немагчымая, — упэўнены **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.** — Таму мы ўсе свае ўстановы вышэйшай адукацыі разглядаем як комплексы, дзе прыярытэтнымі з'яўляюцца навуковыя даследаванні. У нас сёння ў сістэме адукацыі дзейнічае прыкладна 300 навуковых школ па розных кірунках. І калі казаць пра прыярытэты дзяржавы, то нам падаецца, што менавіта ва ўніверсітэтах павінны аднолькава развівацца як фундаментальны, так і прыкладны сектар».

У беларускіх універсітэтах ствараюцца і ўстановы трансферту ведаў, дзе студэнтаў вучаць укараняць навуковыя веды на вытворчасці. Адсюль — вялікая колькасць прадпрыемстваў і цэнтраў, створаных на базе ВНУ. Развіваюцца і новыя формы студэнцкай навукі, у прыватнасці стартап-рух. Летась у Палескім дзяржаўным універсітэце прайшоў першы форум, прысвечаны менавіта гэтаму віду дзейнасці.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

Ад кааперацыі — да сумесных інавацый

Такія задачы ставяць перад дзелавымі коламі ўрады Беларусі і Санкт-Пецярбурга. Пра гэта ды іншыя кірункі ўзаемадзеяння паведаміў Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр Беларусі, падчас пасяджэння Савета дзелавога супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Санкт-Пецярбурга, якое адбылося ўчора ў горадзе на Няве. Наступная сустрэча такога ж узроўню пройдзе ў чацвёртым квартале 2016 года.

Фота БЕЛТА.

— Санкт-Пецярбург — адзін з самых важных гадлёва-эканамічных партнёраў Беларусі сярод расійскіх рэгіёнаў, — заявіў Андрэй Кабякоў. — Па выніках 2015 года наш тавараразварот склаў амаль паўтара мільярда долараў. Гэта не мала, але значна менш, чым было ў 2014 годзе. Тады мы мелі два мільярды долараў. Гэта быў пік. Мы павінны ў бліжэйшай перспектыве выйсці на тое, каб паказчыкі 2014-га года сталі звычайнымі і нават пераўзыдзенымі.

Беларускі прэм'ер станоўча ацаніў супрацоўніцтва паміж Беларуссю і горадам на Няве і адзначыў, што «ўсім нам неабходна садзейнічаць яго развіццю». Асноўнымі кірункамі мусяць стаць сферы вытворчай кааперацыі, транспартных, будаўнічых паслуг, экспартных паставак беларускіх тавараў, харчовых прадуктаў. Двухбаковыя адносіны, па словах старшыні Саўміна, — добры прыклад наладжвання міжрэгіянальных сувязяў.

Беларуская ўрадавая дэлегацыя агледзела экспазіцыю Цэнтра імпартазамяшчэння і лакалізацыі і наведала навукова-вытворчае аб'яднанне па перапрацоўцы пластмас «Камсамольская праўда». **Генеральны дырэктар аб'яднання Сяргей ЦЫБУКОЎ** падкрэсліў, што сумесны беларуска-піцерскі праект «доўгайграючы, стратэгічны, распісаны па гадах».

Для піцерскага НВА былі закуплены тэрмапласт-апараты Баранавіцкага станкабудаўнічага завода «Атлант». «Мы арганізавалі сумесны навучальны цэнтр, стварылі новую прафесію — механік-наладчык, запусцілі спецыяльныя курсы. Цяпер ствараецца інжынірынгавы цэнтр, — сказаў Сяргей Цыбукоў, каментуючы падпісанне адпаведнага дакумента.

Губернатар Санкт-Пецярбурга Георгій ПАЛТАЎЧАНКА заўважыў, што ў двухбаковым супрацоўніцтве назіраецца станоўчы трэнд развіцця. «Ён заключаецца не толькі ў нарошчванні паступленняў тых ці іншых тавараў, у тым ліку прадуктаў харчавання, — лічыць кіраўнік паўночнай сталіцы Расіі. — Мы маем добрую тэндэнцыю да развіцця кааперацыі, няхай пакуль і першаснага ўзроўню. Мы ставім перад сабой задачу перахадзіць ад кааперацыі да больш шчыльнага супрацоўніцтва для стварэння інавацыйных, высокатэхналагічных прадуктаў, з якімі горад Санкт-Пецярбург і Рэспубліка Беларусь маглі бы выхадзіць на знешнія рынкі».

Адметнай падзеяй мінулага года сталі Дні Мінска ў Санкт-Пецярбургу, якія адбыліся ўвосень. Па словах **Андрэя ШОРЦА, старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта**, дзякуючы ім быў падпісаны шэраг дакументаў, падчас кірмашоў — кантракты на 500 тысяч долараў, агучаны дамоўленасці аб адкрыцці пунктаў па продажы беларускіх абутку і касметыкі, развіцці медыцынскай і фармацэўтычнай сфер. «Мы і надалей будзем развіваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва і чакаем Санкт-Пецярбург з візітам у адказ», — сказаў мэр беларускай сталіцы.

Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ станоўча адзначыла ўзаемадзеянне ў вобласці друку і інфармацыі. Па яе словах, піцерскія калегі па пяры пастаянна ўдзельнічаюць у профільных мерапрыемствах беларускага боку. «Гэта павышае прафесійнае майстэрства і самае галоўнае — садзейнічае аб'ектыўнаму інфармаванню аб шматгранным супрацоўніцтве Беларусі і Санкт-Пецярбурга», — лічыць міністр.

Таксама важным кірункам у гуманітарным супрацоўніцтве выступае кніжна-выдавецкая дзейнасць, дадала Лілія Ананіч. Яна выказала падзяку губернатару Георгію Палтаўчанку за тое, што Беларусь была прадстаўлена на Санкт-Пецярбургскім міжнародным кніжным салоне ў якасці краіны — ганаровага госця. Міністр адзначыла, што ўжо праз колькі дзён Беларусь чакае прадстаўнікоў Санкт-Пецярбурга на XXIII Мінскую міжнародную кніжную выставу-кірмаш.

Што тычыцца лічбавага вымярэння адносін, то на працягу апошніх гадоў узаемны тавараразварот паступова павялічваўся і вырас з 983 мільёнаў долараў у 2010 годзе да 1950 мільёнаў у 2014-м. Але ў студзені—лістападзе мінулага года знізіўся амаль на 30% у параўнанні з пазамінулым і склаў 1 млрд 284 мільёнаў долараў. Сальда традыцыйна засталося станоўчым — 303 мільёны долараў.

Аснову беларускага экспарту ў Санкт-Пецярбург складаюць пастаўкі мясной і малочнай прадукцыі, нафтапрадуктаў, а таксама цукру, таматаў, яблыкаў ды груш. У студзені—лістападзе мінулага года амаль па ўсіх пунктах назіраўся спад экспарту, акрамя садавіны, цукру і вырабаў з пластмасы. Пры гэтым пастаўкі нафтапрадуктаў скараціліся ў 2,7 раза, а ялавічыны, якая з'яўляецца першай у грашовым эквіваленце па аб'ёмах экспарту, на 31%.

У той жа час з Санкт-Пецярбурга на беларускі рынак пастаўляюцца легкавыя аўтамабілі, тытунь і яго заменнікі, бананы, трубы, электрычныя рухавікі і генератары. Рост назіраўся ў пастаўках тытуню і яго заменнікаў, рухавікоў і генератараў, абутку і харчовых прадуктаў, а па астатніх пазіцыях імпарт значна знізіўся.

Пра канкрэтны характар пасяджэння Савета дзелавога супрацоўніцтва сведчыць і той факт, што выступоўцы — кіруючыя асобы з абодвух бакоў — казалі не толькі пра «плюсы», але і аб праблемах, і шукалі спосабы іх вырашэння. Напрыканцы быў падпісаны пратакол, а таксама наменклатура і аб'ёмы паставак харчовых тавараў з Беларусі ў Санкт-Пецярбург у 2016 годзе.

Пасля ўдзелу ў Савеце дзелавога супрацоўніцтва прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў сустрэўся з расійскім калегам Дзмітрыем Мядзведзевым. Кіраўнік беларускага ўраду падкрэсліў, што Беларусь і Расія прадоўжаць супрацоўніцтва ва ўсіх сферах.

«Разлічваю, што сёння мы ўсё змястоўна абмяркуем і напярэдадні Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы даложым кіраўнікам дзяржаў, што ў нас ёсць план, разлікі і перспектывы, каб праявы, звязаныя з эканамічнай нестабільнасцю, паспяхова пераадольваліся», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

Паводле яго слоў, у гэтым годзе ўжо прыняты шэраг рашэнняў у Саюзнай дзяржаве. «Прапаную падвесці вынікі і намеціць план супрацоўніцтва», — сказаў Андрэй Кабякоў.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by
Санкт-Пецярбург.

■ Адзнака

НАЙЛЕПШЫЯ ТАВАРЫ КРАІНЫ

Вызначаны лаўрэаты конкурсу «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» 2015 года. Было адзначана 248 тавараў, якія выпускаюцца 143 арганізацыямі Беларусі.

Прадпрыемствам, тавары якіх удастоены звання лаўрэата, будуць уручаны дыпломы і дадзена права размяшчэння лагатыпа конкурсу на таварах і іх упакоўцы, а таксама ў дакументацыі і рэкламных матэрыялах.

У намінацыі «Харчовыя тавары» лаўрэатамі сталі 168 найменняў прадуктаў 84 арганізацый. Па катэгорыі «Прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння» вызначаны 46 тавараў-пераможцаў 30 прадпрыемстваў, а ў намінацыі «Прамысловыя тавары для насельніцтва і вырабы народных промыслаў» — 31 тавар, які выпускаецца 26 арганізацыямі. Звання лаўрэата конкурсу ў намінацыі «Паслугі насельніцтву» ўдастоены 3 арганізацыі.

У прэс-службе Дзяржстандарта адзначылі, што многія прадпрыемствы ўдзельнічаюць у конкурсе штогод і перамагаюць у ім, бо стабільна забяспечваць высокі ўзровень прадукцыі і пашыраюць яе асартымент. Сярод іх — акцыянерныя таварыствы «Савушкін прадукт» (Брэст), «Беллакт» (Ваўкавыск), кіруючая кампанія холдынга «Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка» (Віцебск), «Калінка» (Салігорск), Беларускі металургічны завод — кіруючая кампанія холдынга «Беларуская металургічная кампанія» (Жлобін) і іншыя.

— Ёсць прадпрыемствы, якія ўпершыню ўдзельнічалі ў гэтым конкурсе і адразу сталі яго лаўрэатамі. Напрыклад, гэта Ляхавіцкі малочны завод, камбінат «Усход» (Гомельская вобласць), СВК «Прагрэс-Верцялішкі» (Гродзенская вобласць), СВК імя В.І. Крамко (Гродзенская вобласць), ТАА «ЭФЕКТЫЎНЫЯ СІСТЭМЫ ЎПАКОЎКІ» (Мінская вобласць) і іншыя, — падкрэслілі ў прэс-службе камітэта.

Звесткі аб таварах-лаўрэатах і іх вытворцах размяшчаюцца на сайце Дзяржстандарту (www.gosstandart.gov.by) і ў штогадовым ілюстраваным каталогу «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», які рассылаецца ў прадстаўніцтвы нашай краіны за мяжой.

Дар'я ШОЦІК

■

ПРАКУРОРСКІ ІСК ДА... СЫНА

Пракурорам усіх раёнаў даручылі наведаць на даму людзей, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту, інвалідаў першай групы, і паглядзець, як пра іх клапоцяцца сацыяльныя работнікі, а таксама сваякі, атрымліваючы грашовую дапамогу па доглядзе гэтых людзей. Аб гэтым паведаміў пракурор Гродзенскай вобласці Віктар МАРОЗАЎ.

Як вядома, клопат аб састарэлых бацьках — гэта яшчэ і канстытуцыйны абавязак дзяцей. І калі няма сумлення, то пра патрабаванні заканадаўства нагадае пракуратура. Вялікаўзроставае дзіця атрымлівае афіцыйнае папярэджанне са спасылкай на закон. Не ўсвядоміў сваёй адказнасці — у інтарэсах састарэлых бацькоў у суд накіроўваецца іск аб спагнанні з такіх дзяцей аліментаў.

— Гэта робяць не самі пажылыя людзі (вядома ж, ім сорамна прыцягваць да судовай адказнасці сваіх дзяцей), а пракуроры. Такія прыклады былі ў Гродзенскім, Шчучынскім раёнах, у абласным цэнтры, — зазначыў Віктар Марозаў.

Акрамя таго, дзяцей, якія ігнаруюць свае апякунскія абавязкі па доглядзе бацькоў, пазбаўляюць грашовай дапамогі. За апошнія гады на Гродзеншчыне было каля двухсот выпадкаў, калі адпаведныя выплаты спыняліся.

Барыс ПРАКОПЧЫК.